Ілюстрацыі да артыкула Д. Сяліцкай



*Іл. 1. Яўрэйскі аддзел Беларускага дзяржаўнага музея. Пачатак 1930-х гг.*
*Паводле фотаальбома "Беларусь Савецкая" [9, с.76]*



*Іл. 2. Пасудзіна для захавання Этрога. Кан. XIX – пач. XX стст. Польшча.*
*Паступіла ў фонды Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь ў 1957 г.*

*Дар'я Сяліцкая*

# Лёс яўрэйскай калекцыі Беларускага дзяржаўнага музея

Пачатак гісторыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (далей НГМ РБ) можна аднесці да моманту заснавання ў 1907–1908 гг. пры Мінскім царкоўным гісторыка-археалагічным камітэце Мінскага царкоўна-археалагічнага музея. У час Першай сусветнай вайны зборы музея, якія налічвалі больш за 3000 музейных прадметаў [24, с. 4], былі эвакуіраваны ў Разань [8, с. 49]. 20 студзеня 1919 г. у Мінску быў заснаваны абласны музей, і ўжо ў 1920 г., пры адступленні палякаў з Мінску, музей быў разграблены, а найбольш каштоўныя музейныя рэчы вывезены [14, с. 48].

Аднаўленне абласнога музея прыйшлося на пачатак беларусізацыі 1921–1922 гг. [12, с. 25 ]. Размяшчаўся музей у будынку архірэйскага дома[1]. У гэты час у склад абласнога

[1]Знаходзіўся на месцы цяперашняга Дома афіцэраў.

музея ўвайшлі фонды вышэй упамянутага Мінскага царкоўна-археалагічнага музея, вернутыя ў Беларусь толькі ў 1922 г. [24, с. 4]. З 31 жніўня 1923 г. абласны музей, які фактычна выконваў функцыю дзяржаўнага, стаў Беларускім дзяржаўны музеем (далей БДМ). [23, с. 12]. У 1924 г. яму быў нададзены статус цэнтральнай музейнай установы з аддзяленнямі ў Віцебску і Магілёве (з 1926 г. і ў Гомелі) [12, с. 27]. У гэты перыяд пачалося актыўнае папаўненне музейных збораў.

Яўрэйскі аддзел БДМ пачаў арганізоўвацца 15 снежня 1924 г. [18, арк. 56]. Аб яго заснаванні ў часопісе «Полымя» было аб'яўлена ў 1925 г. [25, с. 170]. Загадчыкам аддзела з самага пачатку яго існавання быў прызначаны Аляксандр Давыдавіч Палеес – яўрэй па нацыянальнасці, гісторык, антыквар, мастацтвазнаўца. Яўрэйскі аддзел, у адрозненні ад іншых, якія існавалі яшчэ з часоў абласнога музея, збіраўся нанова. Размяшчаўся ён на першым паверсе былога архірэйскага дома [17, арк. 56]. Папаўненне калекцыі адбывалася за кошт перадачы музейных прадметаў з іншых музеяў, экспедыцый, набыцця ў грамадзян, праз ахвяраванні і інш.

Некалькі здымкаў мінскіх і слуцкіх сінагог паступіла ў 1925 г. ад М. М. Шчакаціхіна [6, с.23].

У 1926 г. пачаліся перамовы аб перадачы з Віцебскага аддзялення шэрага яўрэйскіх каштоўнасцей, якія ўваходзілі ў склад вядомай калекцыі А. Р. Брадоўскага [16, арк. 2]. Нягледзячы на супраціў навуковых супрацоўнікаў Віцебскага музея, згодна з пастановай «Аб канцэнтрацыі мастацкіх і гісторыка-культурных каштоўнасцей» ад 14 лістапада 1924 г.

[12, с. 27], у БДМ былі перададзены 54 прадметы яўрэйскай культуры з Віцебскага музея. Гэта былі выдатныя помнікі – тасы[1], ханукальныя лямпы[2], шабатныя падсвечнікі, літаграфіі, прадметы побыту і інш. [22]. У гэты час у аддзел паступілі не меней цікавыя і каштоўныя рэчы, аб чым у 1926 г. пісалі ў «Хроніцы беларускай культуры»: «Яўрэйскі аддзел БДМузэю ў Менску за апошні час папоўніўся шэрагам прадметаў яўрэйскай старажытнасьці, сярод якіх асаблівую ўвагу зварочваюць на сябе пісаныя на паргаміне Кабалла і малітоўнік, якім па 300 год і якія атрыманы з мяст. Лядаў і Дуброўны…» [26, с. 198].

У 1927 годзе яўрэйскім аддзелам была запланавана экспедыцыя ў «…напрамку Дуброўна – Орша – Расна – Мсціслаўль – Калінінск на 10 дзён. Выдзеліць для гэтага 150 рублёў…» [16, арк. 255]. Але дакументаў аб здзяйсненні гэтай паездкі пакуль не знойдзена.

Набываліся каштоўнасці і шляхам абмену. Так у 1928 г. БДМ праводзіць абмен з Узлянскай абшчынай: «…БДМузэй дае Узьлянскай абшчынеківот б. Мінскай харальнай сінагогі… ад Узьлянскай сынагогі атрымлівае ківот 18-га стаг….» [17, арк. 64-65]. У тым жа 1928 г. аддзел здзяйсняе абмен «…медзянага, накладнага серабра, ханукальнага падсвечніка, які запісаны ў інвентарную кнігу пад №6480 на гравіраваную медзяную тацу XVII ст., якая знаходзіцца ў Бэс-Медрашы[3] | Школьная вул., сынагальны падворак | і

[1]Тас ( іўр. טס לתורה ) – традыцыйны яўрэйскі атрыбут, які выкарыстоўваўся для таго, каб знайсці неабходную для чытання главу Торы.

[2]Ханукальная лямпа (іўр. חנוכה; ханукія) – свяцільня, якую запальваюць на працягу васьмі дзён у свята Ханука.

[3]Магчыма, мелася на ўвазе Бэйт-Мідраш (іўр. בית מדרש, дом вучэння) – месца, якое прызначана для пастаяннага вывучэння Торы, часцей за ўсё знаходзілася ў будынку сінагогі.

прадстаўляе для Музэю значную каштоўнасьць» [17, арк. 10].

На тэрыторыі РСФСР таксама былі адшуканы яўрэйскія каштоўнасці, якія вывозіліся з беларускіх зямель з канца XVIII і да пачатку XX стст. Беларускім бокам былі здзейснены неаднаразовыя спробы вяртання страчаных рэчаў. Сярод шэрага помнікаў, якія знаходзіліся ў расійскіх музеях і ў адносінах да якіх былі зроблены спробы рэпатрыяцыі каштоўнасцей, былі: 1) калекцыя, сабраная жыхаром Віцебска Рапапортам (Ан-скім), якая выпадкова трапіла ў Рускі музей; 2) шрыфт і абсталяванне старажытнай яўрэйскай друкарні, што былі канфіскаваны ў 1920 г. падчас спробы перавезці іх праз мяжу і, на думку беларускага боку, на той момант знаходзіліся ў Гомельскім музеі; 3) разнастайныя вырабы яўрэйскага мастацтва, падараваныя ў розныя часы прадстаўнікамі яўрэйскіх кагалаў царскім асобам падчас праезду апошніх па тэрыторыі Беларусі (напрыклад, у 1904 г. у Віцебску Мікалаю II была паднесена Тора старажытнай работы); 4) яўрэйскія культавыя рэчы, канфіскаваныя з сінагог і малітоўных дамоў у 1922 г. [7, с. 27]. Пастанаўленнем СНК СССР «О возвращении в Белорусский Государственный Музей некоторых Музейных экспонатов из Музеев РСФСР» ад 05.07.1926 г. у вяртанні калекцыі Рапапорта было адказана, у сувязі з тым, што яна мае агульнасаюзнае значэнне. Астатнія каштоўнасці павінны былі вярнуць установы, у якіх яны захоўваліся. З Гомельскага музея, на пытанне пра месцазнаходжанне шрыфта і абсталявання старажытнай яўрэйскай друкарні, прыйшоў адказ, што такія прадметы ў фондах адсутнічаюць. Тое ж можна і сказаць пра Тору,

падараваную Мікалаю ІІ, якая знаходзілася ў Зімнім палацы і далейшы лёс якой невядомы [16, арк. 32].

У 1928 г. Казанскім дзяржаўным універсітэтам быў перададзены «Адрес Полоцких евреев Екатерине Великой на 6 листах, 1780 г.» [17, арк 15].

На працягу 1931–1932 гг. у зборы БДМ трапіла частка калекцыі музея Яўрэйскага гісторыка-этнаграфічнага грамадства, сабраная Ан-скім[1]. Музей быў ліквідаваны ў 1929 г., а калекцыя раздзелена паміж іншымі музеямі. Намаганнямі беларускага боку частка калекцыі была перададзена ў Мінск [21].

З канца 1920-х. гг. пачала змяняцца палітыка ў адносінах да музеяў, многія музейныя ўстановы былі раскрытыкаваны за недастатковую ідэалагічную працу з пункту гледжання сацыялістычнага будаўніцтва. Пачалася перабудова музеяў [12, с. 45]. Яўрэйскі аддзел (гл. мал. 1) неаднаразова падвяргаўся крытыцы за вялікую колькасць прадметаў рэлігійнага характару: «…У яўрэйскім аддз. для гледача складаецца ўражаньнне, што яўрэі толькі моляцца богу. Няма яўрэя-рамесьніка, яўрэя-земляроба, яўрэя-гандляра, няма падзелу на клясы…» [18, арк. 22аб].

Паралельна з інтэнсіўнай працай па набыццю каштоўнасцей, якая праводзілася на працягу 1920-х – пачатку 1930-х гг., кіраўніцтву музея прыходзілася выконваць загады ўсесаюзнага аб'яднання па экпарту «Антыкварыят». Сутнасць палітыкі заключалася ў адборы

[1]Ан-скі (Рапапорт) Сямён Акімавіч – яўрэйскі пісьменнік, публіцыст, этнограф, грамадскі дзеяч; ураджэнец г. Чашнікі. Здзейсніў этнаграфічную экспедыцыю па Падоліі і Валыні, дзе сабраў шматлікі этнаграфічны матэрыял, які стаў асновай музея Яўрэйскага гісторыка-этнаграфічнага грамадства.

і продажы мастацкіх і гістарычных каштоўнасцей за мяжу, што папаўняла валютай дзяржаўную казну. Значная частка помнікаў яўрэйскай культуры на працягу 1931–1932 гг. была передадзена ў распараджэнне ўсесаюзнага аб'яднання па экспарту «Антыкварыят» для продажу за мяжу. Так, напрыклад, у акце ад 2 лістапада 1931 г. надрукаваны пералік прадметаў «…имеющие экспортное значение…» [19, арк. 16]. Па гэтым спісе з яўрэйскага аддзела перадавалася больш за 80 найкаштоўнейшых прадметаў: срэбраныя кароны Торы, тасы, ханукальныя свяцільні, падсвечнікі, ламбрыкены, парэйхасы і шмат іншых. [19, арк. 16-20]. 11 сакавіка 1932 г. для рэалізацыі за мяжу быў атабраны шэраг мастацкіх работ, сярод якіх работы Л. Антакольскага, Я. Кругера, Ю. Пэна і інш. [19, арк. 4].

БДМ у 1930 г. страчвае будынак архірэйскага дома і вымушаны перасяліцца ў Дом селяніна, які значна ўступаў па плошчы. У 1933 г. адбылася рэарганізацыя экспазіцыі, у выніку якой яўрэйскі аддзел разам з іншымі быў зачынены [13, с. 7]. Паслядоўныя арышты дырэктароў і звальненне ўсіх вопытных супрацоўнікаў, ідэалагічнае даўленне прывялі музей у заняпад. Фактычна, у такім стане ён заставаўся да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Трэба адзначыць, што на пачатку вайны калекцыя БДМ не была эвакуіравана. Таму, яшчэ да адпраўкі ў 1944 г. усіх каштоўнасцей па маршруце Істэнбург-Гохштадт, музей перажыў рабаванні з боку як немцаў, так і мясцовых жыхароў [15]. У 1943 г. яўрэйскія культурныя каштоўнасці былі адпраўлены ў Венскі істытут гебраістыкі [11, с. 31 ]. У зборніку «Вяртанне-1» быў апублікаваны спіс яўрэйскіх

каштоўнасцей, складзены А. Шукелойцам[1], што былі перададзены «штабу Р.Р»[2] [27, с. 108]. У большасці, гэта пісьмовыя помнікі, выяўленчае мастацтва, прадметы рэлігійнага характару. У спісе ўказаны ўсяго 236 прадметаў з кароткім апісаннем, без уліковых нумароў.

У 1944 г. музей фактычна спыніў сваё існаванне.

Пасля Другой сусветнай вайны пачаўся працэс вяртання каштоўнасцей. У 1947 г. з Берліна ў Мінск былі накіраваны два вагоны. Быў складзены спіс на 229 лістах, у якім быў адзначаны 3491 прадмет [1]. Паколькі Беларускі дзяржаўны музей не быў адноўлены (гэта адбылося толькі ў канцы 1956 г.), усе музейныя прадметы былі размеркаваны паміж Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (далей БДМГВАВ), Дзяржаўным мастацкім музеем (цяпер Нацыянальны мастацкі музей) і Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем. На працягу 1950–1960-х гг. у збор будучага Дзяржаўнага музея БССР актыўна перадаваліся рэшткі былой калекцыі БДМ. Каштоўнасцей, якія ўваходзілі ў склад яўрэйскай калекцыі, вярнулася вельмі малая колькасць: каля 70 музейных прадметаў – тасы, бсамімы[3], рыманім[4], пасудзіна для захаван-

[1]Антон Шукелойц – дырэктар БДМ ( у час акупацыі – краязнаўчы музей) з 1941 па 1944 гг.

[2]Штаб Р.Р. (штаб рэйхсляйтэра Розэнберга) – арганізацыя ў нацысцкай Германіі, якая займалася зборам, улікам, канфіскацыяй і вывазам культурных каштоўнасцей, бібліятэк і архіваў з акупіраваных тэрыторый.

[3]Бсамім (іўр. בסמים) – невялікая пасудзіна для духмяных рэчываў, якая выкарыстоўвалася ў час завяршэння Шабату.

[4]Рыманім (іўр. רימון, плод граната) – наверша Торы.

ня этрога[1] (гл. мал.2), конаўкі з дзвюма ручкамі, рэчы этнаграфічнага характару, графіка, скульптура і інш. [2; 3; 4; 5].

У 2019 годзе ў фонды Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь з БДМГВАВ быў перададзены шэраг музейных прадметаў невызначанага паходжання. Дзякуючы ўліковым нумарам, якія захаваліся на прадметах, удалося вызначыць, што прадметы паходзяць з даваеннага збору БДМ. Сярод перададзеных помнікаў 22 прадметы мелі адносіны да яўрэйскай культуры – гэта 16 тасаў, ханукальная свяцільня, фрагмент ханукальнай свяцільні, тфілін, яд[2] і іншыя.

У гэты ж час з Ізраільскага музея (г. Іерусалім) прыйшло паведамленне, што ў іх зборы знаходзіцца музейны прадмет «Кабалістычны амулет», на якім нанесены штамп БДМ і нумар 6029/1. Бясспрэчна тое, што гэты прадмет паходзіў са збораў Беларускага дзяржаўнага музея. Гэта падзея дала штуршок для наступных пошукаў, дзякуючы якім знайшліся 10 музейных прадметаў з нумарамі і штампамі БДМ. (табл. 1)

***Табл. 1. Спіс прадметаў са збору былога Беларускага дзяржаўнага музея, якія знаходзяцца ў Ізраільскім музеі (г. Іерусалім)***

| № пп | Назва, кароткае апісанне | Нумар БДМ |
|---|---|---|
| | Канверт для мацы. Мір, Беларусь. 1889 г. 43×38 см | 7318 |
| | Покрыва для мацы. Польшча. 1900 г. 28×36,5 | 7274 |
| | Капарэт. Клецк, Беларусь. 1824 г. 32×78 см | 8275 |
| | Покрыва для халы. Польшча (?). Канец XIX ст. 43×46 см | 7389 |
| | Мізрах. Польшча (?). 1861 г. 30,5×27,5 см | 8341 |
| | Талерка для седэра. Цэнтральная Еўропа (?). XIX ст. Дыяметр 24,2 см | 685 |
| | Дэкаратыўная талерка. Расія. Канец XIX ст. Дыяметр 26 см. | 637 |

[1]Этрог (іўр. אתרוג)  – яўрэйская назва цытрона,галоўны сімвал свята Сукот..
[2]Яд (іўр.יד, “рука”) – указка для чытання Торы.

| | | |
|---|---|---|
| | Абрус (тканіна) для канторскага стэнда. Тракай, Літва. 1893 г. 142×52 см. | 7322 |
| | Талерка для седэра. Польшча. Пачатак XX ст. Дыяметр 29,5 см. | 640 |
| | Кабалістычны амулет. Усходняя Еўропа. XVIII ст. 673×22 см | 6029/1 |

У будучым часе гэты спіс будзе папаўняцца, бо праца па пошуку не прыпынілася і вядзецца сумесна з ізраільскімі калегамі. Магчыма, у хуткім часе гэтыя прадметы мы ўбачым у зборах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

## Крыніцы і літаратура


1. Акт и опись музейных экспонатов, возвращенных в БССР из Германии, 08.12.1947 // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 790. Воп. 1. Спр. 69. Арк. 1–229.
2. Акт приема №156 от 1.04.1957 // Архіў аддзела ўліку Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (НГМ РБ).
3. Акт приема №157 от 27.04.1957 // Архіў аддзела ўліку НГМ РБ.
4. Акт приема №498 от 03.11.1961 // Архіў аддзела ўліку НГМ РБ.
5. Акт приема №547 от 4.11.1962 // Архіў аддзела ўліку НГМ РБ.
6. Бамбешка, І. І. Камплектаванне фондаў Беларускага дзяржаўнага музея ў 20-я гг. /І. І. Бамбешка // Музейны веснік / НМГіКБ. – Мн. : Юніпак, 2005. – С. 10–17.
7. Бамбешка, І. І. Паступленні ў Беларускі дзяржаўны музей са сховішчаў Масквы і Ленінграда ў 1922–1927-я гг.: новыя дакументы і факты / І. І. Бамбешка // Музейны веснік / НМГіКБ. – Мн. : Юніпак, 2005. – С. 24–30.

8. Белорусский государственный музей // Белорусская культура. Сб. 1 – Мн. – 1928. – С. 49–54.
9. Беларусь Савецкая: фотаальбом / фотаздымкі: І. Салавейчыка [і інш.] – Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1932. – 101 с.
10. Віцебскі абласны краязнаўчы музей. Навуковы архіў. – Ф. 11. – Спр. 4. Копія.
11. Гужаловский, А. А. Белорусские музеи в период Великой Отечественной войны. / А. А. Гужаловский // Вопросы музеологии / Санкт-Петербургский государственный университет. – СПб : Спбгу. – 2018. – С. 27–38.
12. Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2002 – 176 с.
13. Ксяневіч, Ю. Структура Беларускага дзяржаўнага музея ў 20–30-я гг. XX ст. / Ю. Ксяневіч // Музейны веснік / НМГіКБ. – Мн. : Юніпак, 2005. – С. 5–10.
14. Ластоўскі, В. У. Беларускі дзяржаўны музей / В. У. Ластоўскі // Наш край. – 1927. – №10. – С. 47–52
15. Мальдис, А. И. Немецкий след. Что было вывезено во время нацистской оккупации и что возвращено? / А. И. Мальдис // Беларусь сегодня. – 2008. – №126.
16. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1927.
17. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935.
18. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 101. Воп. 1. Спр. 3504.
19. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 126. Воп. 1. Спр. 176.
20. Сініла, А. М. Зборы мінскіх музеяў у Картатэцы ўласнасці мастацкіх аб’ектаў (1945–1952) Мюнхенскага цэнтральнага зборнага пункту / А. М. Сініла. – Мір: Установа «Музей «Замкавы комплекс «Мір», 2019. – 122 с.

21. Синило, А. Н. Экспонаты из музея Еврейского историко-этнографического общества в собраниях белорусских музеев [Электронны рэсурс] / А. Н. Синило // Забута спадщина (электронний журнал). – 2017. – Рэжым доступу: http://lostart.org.ua/ua/research/909.html – Дата доступу: 09.07.2020.
22. Сьпіс рэчаў яўрэйскай культуры з калекцыі А. Р. Брадоўскага, перададзеных Віцебскім аддзяленнем Беларускага Дзяржаўнага музея // Навуковы архіў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. – Ф. 11. Спр. 4.
23. Харламповіч, П. В. Пяцігодзьдзе Беларускага Дзяржаўнага Музэю / П. В. Харламповіч // Наш край. – 1927. – №1. – С. 10–16.
24. Харламповіч, П. В. Справаздача Беларускага дзяржаўнага музея за час з 1 кастрычніка 1923 г. па 1 кастрычніка 1924 г. / П. В. Харламповіч. – Мінск, 1925. – 7 с.
25. Хроніка жыдоўскай культуры / З. Ф. Жылуновіч [і інш.] // Полымя: літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны часопіс. – 1925. – №3. – С. 170–171.
26. Хроніка беларускай культуры / З. Жылуновіч [і інш.] // Полымя: літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны часопіс. – 1926. – №3. – С. 198–202.
27. Шукелойц, А. А. Экспанаты жыдоўскага аддзелу БД музею перададзены штабу Р. Р. / Шукелойц А. А. // Вяртанне: Дакументы і архіўныя матэрыялы па праблеме пошуку і вяртання нац. каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. – Мінск : «Беларускі фонд культуры», 1992. – С. 108–111.